# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Пасля вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету ў кожнага з вас сфарміраваўся свой багаж ведаў. Для кагосьці пэўныя тэмы засталіся ў памяці як самыя цікавыя, а камусьці з вас было часам складана. Але, несумненна, усе вы сталі ўладальнікамі сучасных і актуальных ведаў, паняццяў і навыкаў па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.

У пачатку вывучэння вучэбнай дысцыпліны мы з вамі казалі пра хуткае і інтэнсіўнае развіццё свету. Доказам гэтаму з'яўляюцца новыя падзеі ў развіцці сусветнай гаспадаркі і насельніцтва, якія адбыліся за гэты навучальны год. Паспрабуйце ўспомніць і пералічыць некалькі найбольш важных з іх.

Вы выканалі шмат заданняў рознага ўзроўню. Аднак за значным аб'ёмам матэрыялу па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету стаяць не толькі шырокія веды. З'яўляючыся сучаснікамі інфармацыйнай эпохі і эпохі паслуг, вы павысілі сваю інфармацыйную пісьменнасць, таму што, дзякуючы пастаянным падарожжам на ўроках па глабальнай сетцы, вы засвоілі кампетэнцыі сацыяльна-эканамічнай і дэмаграфічнай web-навігацыі. Зараз у вас ёсць шырокі набор найбольш рэпрэзентатыўных сайтаў па кожнай вывучанай тэме.

Вы авалодалі навыкамі характарыстыкі геаграфіі сусветнай гаспадаркі і дэмаграфічных працэсаў, тлумачэння іх прычын і наступстваў. Вы змаглі паглядзець на нашу краіну — Рэспубліку Беларусь — з пазіцый яе месца, важнай ролі ў сусветнай гаспадарцы, канкурэнтных пераваг у сістэме міжнароднага геаграфічнага падзелу працы і развіцці асобных галін і відаў эканамічнай дзейнасці. Усё гэта — сведчанне вашага геаграфічнага ладу мыслення і росту геаграфічнай культуры.

Па прычыне дынамізму сацыяльна-эканамічных працэсаў свету многія вучоныя-географы сёння, нягледзячы на багатую гісторыю, называюць сацыяльна-эканамічную геаграфію маладой навукай. Тлумачаць яны гэта з'яўленнем у яе структуры *вялікай колькасці новых напрамкаў* (успомніце некаторыя з іх) і *прыкладной значнасцю эканамічнай геаграфіі* ў XXI ст.

Ад поспехаў развіцця сучаснай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі сёння напрамую залежыць жыццё чалавечага грамадства. Эканоміка-геаграфічныя даследаванні неабходныя для вырашэння праблем і пошуку найбольш рацыянальных шляхоў арганізацыі грамадства: размяшчэння насельніцтва і прадпрыемстваў, эфектыўнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, будаўніцтва дарог і іншых мерапрыемстваў, якія павінны ажыццяўляцца ў інтарэсах не толькі сённяшняга, але і будучых пакаленняў.

Менавіта таму адным з найбольш важных вынікаў вывучэння вамі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету стаў атрыманы вопыт вызначэння сучасных праблем палітычнай геаграфіі, насельніцтва, развіцця галін сусветнай гаспадаркі і веданне вядучых

міжнародных арганізацый, якія каардынуюць іх. Усё гэта спатрэбіцца вам, таму што глабальныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця свету стануць адным з асноўных аб’ектаў вывучэння геаграфіі ў наступным навучальным годзе.

Вы даведаецеся пра асноўныя дэмаграфічныя праблемы (дэпапуляцыю, дэмаграфічнае старэнне, міжнародную міграцыю), іх наступствы і шляхі вырашэння. Адной з важных глабальных праблем чалавецтва з’яўляецца харчовая. Якая яе сутнасць, геаграфічныя праявы і галоўныя наступствы, вам яшчэ трэба будзе вывучыць. Вы таксама даведаецеся пра праблему вычарпальнасці рэсурсаў, энергетычную праблему і шэраг іншых. Асноўнымі прынцыпамі іх вырашэння стануць распрацаваныя ААН Мэты ў галіне ўстойлівага развіцця (МУР) да 2030 г., што з’яўляюцца своеасаблівым заклікам да дзеяння, якое зыходзіць ад усіх краін — бедных, багатых і сярэднеразвітых, і што накіраваныя на паляпшэнне дабрабыту і абарону нашай планеты.

Да сустрэчы ў наступным навучальным годзе!